# У БАЯХ І ПРАЦЫ

Працавітасць і самаадданасць. Мужнасць і геройства... Аб гэтых высакародных рысах чалавечага характару напісана, бадай, не менш, чым на іншыя вечныя тэмы. Але, напэўна, ніколі не перагорнецца апошняя старонка вялікай кнігі аб людзях смелых подзвігаў.

І ў нашым саўгасе «Свабода» ёсць нямала такіх, аб якіх можна пісаць аповесці і паэмы. Гэтыя людзі — ветэраны вайны і працы. Грудзі лепшага шафёра гаспадаркі Уладзіміра Заброцкага ўпрыгожваюць ордэн Славы трэцяй ступені, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна»... Гэты яшчэ няпоўны пералік узнагарод гаворыць аб мужнасці і вернасці Радзіме былога салдата. Цяпер Уладзімір Пятровіч працуе на будаўнічых пляцоўках саўгаса. Кожны дзень ён падвозіць да ўзводзімых аб'ектаў цэглу, цэмент, пясок, гравій і лесаматэрыялы. Камуніст Заброцкі адначасова вядзе вялікую грамадскую работу. Ён з'яўляецца членам партыйнага бюро саўгаса.

Ад Масквы да Берліна — такі баявы шлях былога артылерыста камуніста Паўла Данілавіча Пратасені. У яго шэсць урадавых узнагарод. Сярод ордэнаў і медаляў, як вехі ваенных дарог, ёсць медалі «За абарону Масквы» і «За ўзяцце Берліна». Там, у цэнтры фашысцкага логава, закончыў баявы шлях цяперашні саўгасны механік з залатымі рукамі. Без Паўла Данілавіча на працягу апошніх год, здаецца, не адзін механізм у саўгасе не пачынаў жыць. У апошнія дні красавіка т. Пратасеня са сваімі памочнікамі змантіраваў другую даільную ўстаноўку «Імпульс» на Пагосцкай малочнатаварнай ферме.

На розных участках саўгаснай вытворчасці на працягу раду гадоў працуюць былыя воіны. Кавалер ордэна Чырвонай Зоркі і многіх медаляў Мікалай Васільевіч Трухан узначальвае брыгаду па накапленню і вывазцы мясцовых угнаенняў. Пры плане 35 тысяч тон яго брыгада даставіла пад яравыя культуры гэтага года 40 тысяч тон тарфагноевых кампостаў. Гэтыя лічбы красамоўна гавораць, як працуе ветэран вайны камуніст Трухан.

Загадчык рамонтнай майстэрні саўгаса Яўген Андрэевіч Цішкевіч, перадавы камбайнер Сяргей Паўлавіч Цясоўскі, фуражыр Міхаіл Аляксеевіч Трызнюк, брыгадзір комплекснай брыгады Уладзімір Пратасеня і многія іншыя былыя воіны з'яўляюцца лепшымі працаўнікамі нашага саўгаса.

Яны выступаюць запявалами сацыялістычнага спаборніцтва на ўсіх участках саўгаснай вытворчасці. З былых воінаў бяруць прыклад маладыя рабочыя, вучацца ў іх камуністычным адносінам да працы.

Сёння ветэраны вайны і працы пройдуць у святочных першамайскіх калонах разам з тымі, хто, як і яны, узводзяць самаадданай працай светлы будынак камунізма.

Зараз, у пярэдадзень 20-годдзя Вялікай Перамогі ад усяго сэрца хочацца пажадаць усім ветэранам вайны і працы доўгіх гадоў шчаслівага жыцця і плённай працы на карысць Радзіме.

**Я. ГРЫШЧЭНЯ,**
сакратар парткома саўгаса «Свабода».